Людка Сільнова

# МАТЫЛЁК
# НА КАРЫ ДРЭВА

*Зборнік вершаў*

Мінск
Выдавец А. М. Янушкевіч
2017

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
С36

**Сільнова, Л.**

С36 Матылёк на кары дрэва : зборнік вершаў / Людка Сільнова. — Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. — 126 с.
ISBN 978-985-7165-31-5.

Зборнік лаўрэата прэміі «Залаты апостраф-2014» складаюць вершы пра ўнутраны свет жанчыны, унучкі вёскі і сучаснай гараджанкі, якая месіць мову, як цеста для піражкоў з чырвоным ягадным варэннем, каб забаць іх з сабой у парк, на прыроду. І на пледзе, падобным да карычневага футра мядзведзя, гартаць разам з ветрам кніжку, назіраць за палётам матылька і смакаваць па кавалачках — па складах і асобных словах — слодыч мяккай матчынай мовы.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-7165-31-5**

© Сільнова Л. Д., 2017
© Афармленне. Выдавец А. М. Янушкевіч, 2017

# ВЕРШЫ-ЎВОДЗІНЫ

*Вершы, якія не ўвайшлі ў раздзелы*
*і самі выскачылі насустрач чытачу*

## ВОЗЕРА

Нібыта каханне
З першага позірку —
Адкрылася мне
Чарадзейнае возера.
Забытай баладай,
Дзявочаю казкаю,
Убранае тонкай
Зялёнаю раскаю.

Сустрэчу пазначыць —
Тут і цяпер! —
Садзяцца стракозы
На прухкі аер.
Нявінных лілеяў
Плыве чарада
Туды, дзе пад сонцам
Святлее вада...

Святлела, круглела
Пад здзіўленым позіркам
Маім (а ці нечым?)
Бліскучае возера.
І вербы ваду яго,
Быццам зубры,
Пілі, каб вярнуцца
Ў святыя бары.

Бацькоўскі куточак?
Нязведаны край?
Люстэрка нябёсаў?
Ці знойдзены рай?..
Жыцця пасярэдзіне,
Ноччу і днём
Няхай яно свеціць
Вільготным агнём!

## СЯБРУ

Спляці
з маім
сваё слова —
І ўбачыш
бітвы сцягі!
Скажу сабе:
«Адмыслова!»
Шапну табе:
«Дарагі...»

Спляці
з маім
сваё слова —
І ўбачыш
неба з ільну...
Радзіма
не можа быць
«новай».
Мы любім —
абое! —
адну.

## ВІНО І МЁД

— Празрыстае віно чакання
Мацнейшае за мёд кахання,
Густы, салодкі, з хлеба лустай,
Каб есці і аблізваць вусны...

— Празрыстае віно чакання
Лягчэйшае за мёд кахання!
Ён цёмны, цяжкі, неадольны
Ў сваім цячэнні запаволеным...

— Налі мне, мілы, келіх мёду.
Я вып'ю за тваю свабоду!

* * *

Зноў пахне дымам, горкім дымам...
І ружавата-чорны ліст,
Абрысамі, як ты, радзіма,
Віруючы, нясецца ўніз.

За ім — кляновае насенне,
Нібыта верталётаў рой,
У ветры круціцца, нясецца
Да гібельнай зямлі сырой...

Жабрачы дух! Якога чорта
Сціскаеш словаў лахманы?
Як ёсць пашкоджана аорта
Лязом іржавае маны...

Апошні дзень.
Апошнім словам.
Бог з намі.
Я заўжды гатова.

* * *

Ты пра мяне не гавары нікому,
Пра сваю слабасць ці пра стому,
Як быццам...
Гэта — не для іх,
Далёкіх, спрошчаных, чужых.

Хіба раскажаш — за хвіліну! —
Што адбылося? І павінна
Было адбыцца? Што даўно
Калісьці ўжо было яно —

І свет успыхнуў і разліўся,
Святлом цудоўным асвятліўся,
Сінечу раскруцілі далі,
І стала ўсё, як мы засталі?..

Хіба каханне — не спатканне?
І не ахвярнае сціскане?
Хіба яно — не паўтарэнне
Сусветных міфаў пра Стварэнне?

Ты пра мяне не гавары нікому.
Дай ціха пераляжаць стому.
Прастора новае дзіця
Люляе ў зыбцы пачуцця.

Яшчэ адзін — магчымы! — свет,
Калі астыне жар планет.

* * *

Бывай, каханы мой, бывай,
Мой любы свет, мой мілы край!

Сукенку мушу я надзець
І на работу паляцець.

...На вулцы — ў шэрым паліто —
Мяне не вызначыць ніхто

Як тую, што складае вершы...
Цікава, кім была я першай?

Раздзел 1

# ПА НАРОДНЫХ МАТЫВАХ

# НА КАЛІНАВЫМ МОСЦЕ

Стаю на Калінавым мосце.
Бывай наўсягды, маё лета!
Ужо не гаспадыня, не госця.
Перш-наперш я толькі Паэта.

А хто прасіў «крыць» яго (божа!)
За гэту шляхетную службу,
Таму ўжо ніхто не паможа
Закону адмовы адужаць.

І ўсё-ткі ён добра прыдумаў
Калісь пра ружовыя шчочкі!
(«Ўрагамі дружкі»... А ты думаў!)
Дагэтуль за Людкаю крочу.

## НІТАЧКА БАРВОВАЯ

Імгненне запаволена.
Я — і ўгары, і долам.

Я — нітачка барвовая,
А рамяство іголкай.

## УЧОРА І СЁННЯ

Учора — толькі гора.
А сёння — шчасця Поўня.

Хачу штодзень, бясконца,
Каб у вакенца — Сонца!

## ШКОЛА РЫФМАЎ

Мне пішацца — як гуляецца:
Я крыкну — і адгукаецца.

Інакш я не ўмею...

Крыкну —
І чую адказ у рыфму.

Мне кажуць:
Не модна болей.
Я — іншай належу школе:
Там дошкамі — горы і скалы.
Іначай бы не пісала!..

Не ведаю, хто паклікаў,
А ведаю — гэта выклік
Нямілае злосьці дню.

Так дыхаю. Так люблю.

# ЛЮБІЦЕ КНІГІ

Любіце кнігі: яны — ластаўкі,
Што прыляцелі ў свет з-за мора сіняга;
Свае кароўкі, што адпасвіліся
І — у двары плывуць: Раба́, Чарна́ і Сі́вая...

Любіце кнігі! Яны — порхаўкі:
Наступіш — і дымок закруціцца...
У чым тваё дзіця там поркаецца —
Ізноў! — маленькай, брыдкай вуціцай?

— От!.. У кнігах.

## СЛОВА Ў ДАРОГУ

— Які ў паэзіі мне шлях абраці, мама? —
Сястра мая ў маці запытала. —
Пайсці ўзмежкам? Або крочыць прама?
І маці, усміхнуўшыся, сказала:
— Я перад белым аркушам паперы
Ніколі не хацела красавацца,
Красуняй штучнай у яго люстэрка,
Нафарбаваўшы вусны, углядацца.
Каралямі сваіх лірычных вершаў
Ніколі не ўпрыгожвала я грудзі.
Ішла наўпрост, у простым плацці, пешшу...
І выйшла — да паэзіі, у людзі.

## «МЯДЗВЕДЗЬ У ГОРАДЗЕ»
*(нізка вершаў)*

## ДЗЕНЬ, ЯКІ ПАЧЫНАЎСЯ ТАБОЮ

Дзень,
    які пачынаўся табою, —
Бы перакулілі
    вядро з сырадоем!
І белым, імклівым,
    таемным цяплом —
Як хлыне
    на вочы і вокны, і дом
Насупраць майго,
    і двары, і дарогі,
Бульвары, прысады
    і зорныя рогі
Барана, што ў небе
    пасе маю сутнасць...
Усё асвятліла
    твая мне прысутнасць!
І як падхапіў хто
    за ручку вядро,
У небе — як грымне
    раскацісты гром!